**Ляскоў Аляксандр Якаўлевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*(Мінск, Беларусь)*

# СТАЎЛЕННЕ КІРАЎНІЦТВА ПАРТЫІ БАЛЬШАВІКОЎ ДА ДЗЯРЖАЎНАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў 1917—1918 ГАДАХ

Фарміраванне самастойных дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі былой Расійскай імперыі ў першай чвэрці XX ст. было звязана, галоўным чынам, з ходам баявых дзеянняў на франтах сусветнай вайны, рэвалюцыйнымі падзеямі 1917 г., актыўнасцю і радыкалізмам нацыянальных палітычных і ваенных арганізацый. Можна сказаць, што перыяд 1917—1918 гг. стаў свайго роду гістарычным «акном магчымасцей» для шэрагу народаў імперыі, якія вылучаліся высокім узроўнем сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця, адчування нацыянальнай ідэнтычнасці, мелі глыбокія дзяржаўна-прававыя традыцыі. Менавіта ў акрэслены час узнікаюць дзяржаўныя канструкты і афармляюцца рашэнні аб незалежнасці аўтахтонных народаў Літвы (16 лютага 1918 г.), Польшчы (11 лістапада 1918 г.), Украіны (22 студзеня 1918 г.), Фінляндыі (6 снежня 1917 г.), некаторых іншых так званых «нацыянальных ускраін».

Беларусь не была выключэннем. У перыяд 1917—1918 гадоў тут адбываюцца інтэнсіўныя працэсы інстытуалізацыі дзяржаўнай улады, прымаюцца важныя прававыя рашэнні, накіраваныя на забеспячэнне суверэнітэту Беларусі ў форме нацыянальнай дзяржавы (БНР) і савецкай рэспублікі (ССРБ).

Безумоўна, аднаўленне дзяржаўнасці беларускага народа не магло адбывацца без цесных узаемаадносін з кіраўніцтвам метраполіі. У сілу вядомых гістарычных прычын галоўным суб'ектам улады ў Расійскай Савецкай Рэспубліцы (з 19 ліпеня 1918 г. — Расійская Сацыялістычная Федэратыўная Савецкая Рэспубліка) была партыя бальшавікоў (РСДРП (б), з сакавіка 1918 г. — РКП (б)).

Асноўны цэнтр прыняцця рашэнняў у РСДРП (б) і РКП (б) — Цэнтральны Камітэт (ЦК). У склад ЦК уваходзіла вышэйшае кіраўніцтва партыі бальшавікоў, найбольш аўтарытэтныя і ўплывовыя асобы, якім належала рэальная партыйная ўлада. Рашэнні ЦК, якую б сферу дзейнасці яны не закраналі, былі абавязковымі для выканання ўсімі партыйнымі арганізацыямі, а потым і органамі дзяржаўнай улады і кіравання.

На VI з'ездзе РСДРП (б), які адбыўся 26 ліпеня — 3 жніўня 1917 г. у Петраградзе, быў абраны склад ЦК партыі бальшавікоў колькасцю 21 чалавек. Склад ЦК змяніўся на VII з'ездзе РКП (б) у сакавіку 1918 г., аднак гэтыя змены не насілі прынцыповага характару.

Трэба адзначыць, што члены ЦК партыі бальшавікоў Ф. Дзяржынскі і М. Крэсцінскі, хаця і нарадзіліся ў Беларусі, але адназначнага стаўлення да яе дзяржаўнай незалежнасці ў разглядаемы перыяд не выявілі.

Затое У. Ленін і І. Сталін не толькі неаднаразова артыкулявалі сваю пазіцыю адносна самастойнага існавання Беларусі, але і аказалі значны ўплыў на фарміраванне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове.

8 лістапада 1917 г. У. Ленін быў абраны старшынёй Савета народных камісараў (СНК) — бальшавіцкага ўраду. Ён з'яўляўся вышэйшым кіраўніком дзяржавы, адказным за прыняцце найбольш важных палітычных рашэнняў.

Наркомам па справах нацыянальнасцяў у складзе СНК стаў І. Сталін. З 8 кастрычніка па 8 ліпеня 1919 г. ён уваходзіў таксама ў склад Рэвалюцыйнага ваеннага савета рэспублікі.

Стаўленне гэтых асоб да Беларусі адпавядала так званай «нацыянальнай палітыцы бальшавікоў» (пад усе свае пазіцыі яны падводзілі дактрынальнае абгрунтаванне). Ужо на ІІ з'ездзе РСДРП у сакавіку 1903 г. абвяшчаецца лозунг «аб праве нацый на самавызначэнне». На V з'ездзе РСДРП у маі 1905 г. да гэтага лозунгу дадаецца больш радыкальная формула — «ажно да аддзялення і ўтварэння самастойнай дзяржавы». Як пісаў У. Ленін у 1914 годзе ў сваёй рабоце «О праве наций на самоопределение», «под самоопределением наций разумеется государственное отделение их от чуженациональных коллективов, разумеется образование самостоятельного национального государства... Не правильно было бы под правом на самоопределение понимать что-либо иное кроме права на отдельное государственное существование».

У Дэкларацыі правоў народаў Расіі, прынятай 15 лістапада 1917 г., — адным з першых дакументаў Савецкай улады, — былі абвешчаны чатыры асноўныя прынцыпы нацыянальнай палітыкі бальшавікоў. У тым ліку пацвярджалася «права народаў Расіі на свабоднае самавызначэнне ажно да аддзялення і ўтварэння самастойнай дзяржавы». Прыняцце гэтага дакумента стала каталізатарам цэнтрабежных працэсаў на прасторах былой імперыі.

Пасля рэвалюцыйных падзей 1917 года прадстаўнікі розных беларускіх палітычных арганізацый актыўна ставілі пытанне аб самавызначэнні беларускага народа і стварэнні дзяржаўнасці Беларусі. Неўзабаве вырашэнне гэтага пытання перайшло ў практычную плоскасць: «30 лістапада 1917 г. Выканаўчы камітэт Вялікай беларускай рады і Выканаўчы камітэт Цэнтральнай беларускай вайсковай рады і Беларускі выканаўчы камітэт Заходняга фронту звярнуліся з адозвай «Да ўсяго народа беларускага», у якой выказаліся за стварэнне ў Беларусі дэмакратычнай рэспублікі, федэрацыю з Расіяй і іншымі суседнімі рэспублікамі і прапанавалі склікаць з'езд прадстаўнікой усяго беларускага народа з мэтай вырашэння гэтага пытання» [2, с. 245]. Ідэя правядзення такога з'езда атрымала шырокую падтрымку ў грамадстве. Адным з арганізатараў гэтага народнага сходу выступіў Беларускі абласны камітэт (БАК), створаны ў лістападзе 1917 г. у Петраградзе пры Ўсерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў. Дзейнасць БАКа падтрымліваў нарком па справах нацыянальнасцяў І. Сталін. Менавіта БАК атрымаў фінансавыя сродкі на правядзенне з'езду ад Савецкага ўрада [3, с. 17]. У гэтым прадстаўнічым форуме, які адкрыўся 5 снежня 1917 г. у Мінску, узялі ўдзел 1872 дэлегаты ад усіх рэгіёнаў Беларусі, розных грамадскіх і палітычных арганізацый. Гэта сведчыць аб тым, што кіраўніцтва партыі бальшавікоў, дазволіўшы правядзенне з'езда і аказаўшы яму фінансавую падтрымку, у цэлым прыхільна ставілася да самавызначэння беларускага народа і стварэння беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове.

Адпаведны падыход быў сфармуліраваны яшчэ ў кастрычніку 1917 г. У. Леніным, які ў брашуры «Удержат ли большевики государственную власть» выказаўся за «немедленное восстановление полной свободы Финляндии, Украины, Белоруссии, для мусульман и т. д.» [4, с. 299].

Відавочна, што драматычныя падзеі, звязаныя з разгонам Усебеларускага з'езду, адбыліся па ініцыятыве так званага Аблвыканкамзаха (фактычна — ваеннай улады). Адпаведную пастанову падпісаў старшыня СНК Аблвыканкамзаха К. Ландар, які постфактум даслаў у СНК Расійскай Савецкай Рэспублікі тэлеграму са сваім тлумачэннем (не ва ўсім праўдзівым) прычын разгону. Адзін з аргументаў — «съезд созван с нарушением условий соглашения с товарищем Сталиным» — пацвярджае актыўны ўдзел кіраўніцтва партыі бальшавікоў (у першую чаргу, І. Сталіна) у падрыхтоўцы Усебеларускага з'езду.

Адным з вынікаў гвалтоўных дзеянняў Аблвыканкамзаха ў дачыненні да беларускіх актывістаў стала радыкалізацыя пазіцый іх лідараў (многія з каторых пасля разгону Усебеларускага з'езду апынуліся ў турме), узрастанне незалежніцкіх настрояў, а таксама падрыў даверу да Савецкай улады ў асяроддзі палітычных арганізацый нацыянальнай арыентацыі.

Утварэнне 9 сакавіка 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) і абвяшчэнне 25 сакавіка 1918 г. яе незалежнасці сталі непрыемным сюрпрызам для кіраўніцтва партыі бальшавікоў. Існаванне «буржуазнай» Беларусі яўна не ўваходзіла ў іх планы. Бальшавікі дакладна размяжоўвалі прымальнае для іх самавызначэнне «нацыянальных ускраін» на савецкай аснове і недапушчальнае, з іх пункту гледжання, утварэнне новых «буржуазных» дзяржаў.

Інфармацыі аб стасунках БНР з Савецкай Расіяй на сённяшні дзень недастаткова. Галоўнае — бальшавікі не прызналі незалежнасці абвешчанай беларускай дзяржавы.

Вядома, што летам 1918 г. адбылася безвыніковая паездка місіі БНР у Маскву, дзе яе ніхто не прыняў.

Адзін з найбольш аўтарытэтных даследчыкаў гісторыі Беларусі гэтага перыяду Анатоль Сідарэвіч выказвае меркаванне, што прэм'ер-міністр БНР А. Луцкевіч нібыта выязджаў у пачатку лістапада 1918 г. у Маскву для правядзення перагавораў з кіраўніцтвам партыі бальшавікоў. Як адзначае Сідарэвіч, «з дзённіка А. Луцкевіча відаць, што ён гатовы быў згадзіцца на федэрацыю з Расіяй, на ўвядзенне канстытуцыі савецкага тыпу ў Беларусі пры ўмове, што Расія прызнае самастойнасць нашай краіны. Але маскоўскія бальшавікі мелі свой погляд на гэта пытанне. І гэты погляд у немалой ступені склаўся пад уплывам А. Мяснікова, В. Кнорына ды іншых дзеячаў Заходняй вобласці (камуны), бо вядома, што 6 лістапада 1918 года з Мясніковым гутарыў Ленін» [5, с. 226].

Не знаходзіць адназначнага дакументальнага пацвярджэння інфармацыя аб існаванні ў Маскве консульскай установы БНР на чале з А. Бурбісам.

Ясна, што У. Ленін, І. Сталін і іншыя кіраўнікі партыі бальшавікоў ігнаравалі БНР і яе ўрад. У вырашэнні пытання дзяржаўнасці Беларусі яны рабілі стаўку на ідэалагічна блізкія і арганізацыйна падпарадкаваныя ім палітычныя структуры.

Пасля паражэння Германіі ў вайне, дэнансацыі Савецкай Расіяй Брэст-Літоўскага дагавора і сыходу нямецкіх войскаў часці Чырвонай Арміі сталі займаць тэрыторыю Беларусі (10 снежня 1918 г. яны былі ў Мінску). Урад БНР аб'яўляўся «звергнутым і распушчаным». Паўстала пытанне аб арганізацыі дзяржаўнай улады ў Беларусі на савецкай аснове.

Можна сказаць, што кіраўніцтва Савецкай Расіі не толькі не марудзіла з вырашэннем гэтага пытання, але і праяўляла адпаведную ініцыятыву. Ужо ў канцы снежня 1918 г. ЦК РКП (б) прыняў палітычнае рашэнне аб стварэнні ССРБ [1, с. 112].

У рамках рэалізацыі прынятага рашэння 25 снежня 1918 г. у Наркамнацы адбылася нарада адказных супрацоўнікаў Беларускага Нацыянальнага Камісарыята, Цэнтральнага Бюро беларускіх камуністычных секцый пры ЦК РКП (б) і камітэта Маскоўскай беларускай секцыі РКП (б). У пратаколе пасяджэння адзначалася: «З абмену думкамі высветлілася, што па прычынах цяперашніх міжнародных адносін, у мэтах умацавання і расшырэння заваёў сацыялістычнай рэвалюцыі... у сучасны момант поўнасцю наспела неабходнасць стварэння Беларусі, як самастойнай ва ўсіх адносінах нацыі, незалежнай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі...» [1, с. 112]

У гэты ж дзень нарком па справах нацыянальнасцяў І. Сталін (відавочна, што пасля правядзення ўказанай нарады) перадаў старшыні Паўночна-Заходняга абкаму РКП (б) А. Мяснікову ў Смаленск тэрміновае паведамленне, згодна з якім «ЦК партыі вырашыў па многіх меркаваннях, аб якіх гаварыць цяпер не даводзіцца, згадзіцца з беларускімі таварышамі на ўтварэнне Беларускага савецкага ўрада. Пытанне гэтае вырашана, і абмяркоўваць ужо не даводзіцца...» [3, с. 31]

Такім чынам, можна з высокай доляй упэўненасці сцвярджаць, што кіраўніцтва партыі бальшавікоў (У. Ленін, І. Сталін і іншыя) у 1917—1918 гадах актыўна падтрымлівала ўтварэнне дзяржаўнасці Беларусі на савецкай аснове. Самавызначэнне беларускай нацыі адпавядала ідэйна-тэарэтычнай базе праводзімай бальшавікамі палітыкі. Дзейнасць БНР у акрэслены перыяд прынцыпова не прызнавалася ўладамі Савецкай Расіі і не ўспрымалася імі як важны фактар міжнародных адносін. Працэсы інстытуалізацыі дзяржаўнай улады ў Беларусі ў 1917—1918 гадах сталі трывалай асновай для далейшага дзяржаўна-прававога развіцця беларускага народа.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Гісторыя Беларускай ССР: у 2 т. — Мінск: Выдавецтва АН БССР, 1958. — Т. 2. — 661 с.

2. Доўнар, Т. І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т. І. Доўнар. Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2014. 415 с.

3. Круталевіч В. А., Юхо І. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917—1945 гг.) — 2-е выд. / В. А. Круталевіч, І. А. Юхо. Мінск: Беларуская навука, 2000. 238 с.

4. Ленин В. И. Полное собрание сочинений — 5-е изд. / В. И. Ленин. М.: Политиздат, 1981. — Т. 34. — 584 с.

5. Сідарэвіч, А. Старонкі з гісторыі БНР / А. Сідарэвіч // Адраджэнне: Гіст. Альманах. Вып. 1 / Склад. і навук. рэд. А. П. Грыцкевіч. Мінск: Універсітэцкае, 1995. — С. 223—229.